European Commission

# Заключэнні Еўрапейскай камісіі адносна заявак на сяброўства ў ЕС

Лістапад 2022
#StrongerTogether







**17 чэрвеня 2022 г.** Еўрапейская камісія прадставіла **заключэнні па заяўках на сяброўства ў Еўрапейскім саюзе** (ЕС), пададзеных у Раду **Украінай**, **Грузіяй** і **Рэспублікай Малдова**. Заключэнні грунтуюцца на **трох ключавых ацэнках**:

### Палітычныя крытэры

Стабільнасць інстытутаў, якія гарантуюць дэмакратыю, вяршэнства закону, правы чалавека і павагу правоў меншасцяў і іх абарону

### Эканамічныя крытэры

Дзейная рынкавая эканоміка і здольнасць справіцца з канкурэнцыяй і выклікамі агульнага рынку

### Здольнасць выконваць забавязанні, абумоўленыя сяброўствам у ЕС

Здольнасць забяспечваць выкананне права ЕС

Заключэнні таксама ўлічваюць намаганні Украіны, Грузіі і Малдовы па выкананні сваіх забавязанняў у рамках **Пагадненняў аб асацыяцыі (ПА)** і Паглыбленай і ўсёабдымнай зоне свабоднага **гандлю (DCFTA)**. Гэтыя пагадненні, падпісаныя ў 2014 годзе, з'яўляюцца прававой асновай для збліжэння Украіны, Грузіі і Малдовы і ЕС. Яны спрыяюць паглыбленню палітычных сувязяў, умацаванню эканамічных узаемадачыненняў і павазе агульных каштоўнасцяў.

## Рэкамендацыі

Камісія рэкамендуе Радзе прызнаць для **Украіны**, **Малдовы** і **Грузіі перспектыву сяброўства** ў Еўрапейскім саюзе.

Камісія рэкамендуе надаць **Украіне** і **Малдове статус краінаў-кандыдатаў** пры тым разуменні, што будзе яшчэ зроблены **пэўная колькасць крокаў**, а такі статус для Грузіі – пасля таго, як будзе вырашаным **пэўны шэраг прыярытэтных задачаў**.

Працэс далучэння па-ранейшаму грунтуецца на **зацверджаных крытэрах і ўмовах**. Што дазваляе зацікаўленай краіне прасоўвацца наперад у залежнасці ад уласных дасягненняў, але таксама азначае, што крокі, каб далучыцца да ЕС, могуць быць адмененыя, калі асноўныя ўмовы больш не выконваюцца.

Еўрапейская камісія будзе сачыць за прагрэсам у выкананні адпаведных **крокаў** у выпадку **Украіны** і **Малдовы**, а таксама **прыярытэтных задачаў** у выпадку Грузіі. Еўрапейская камісія будзе ацэньваць іх у сваім рэгулярным пакеце справаздачаў пра пашырэнне.

*Neighbourhood & Enlargement*

# 2022
## Асноўныя даты

**28 лютага** — **Украіна** падае заяўку на сяброўства ў ЕС

**3 сакавіка** — **Грузія** і **Малдова** падаюць свае заяўкі на ўступленне ў ЕС

**7 сакавіка** — Рада Еўрапейскага саюзу прасіць Еўрапейскую камісію прадставіць свае заключэнні адносна заявак **Украіны**, **Малдовы** і **Грузіі**

**8 красавіка** — **Украіна** атрымлівае анкету адносна палітычных і эканамічных крытэраў

**11 красавіка** — **Грузія** і **Малдова** атрымліваюць анкету адносна палітычных і эканамічных крытэраў



**13 красавіка** — **Украіна** атрымлівае анкету адносна выканання права ЕС

**17 красавіка** — **Украіна** дасылае адказы на пытанні пра палітычныя і эканамічныя крытэры

**19 красавіка** — **Грузія** і **Малдова** атрымліваюць анкету адносна ўвядзення *права ЕС*

**22 красавіка** — **Малдова** дасылае адказы на пытанні пра палітычныя і эканамічныя крытэры

**2 траўня** — **Грузія** дасылае адказы на пытанні пра палітычныя і эканамічныя крытэры

**9 траўня** — **Украіна** дасылае адказы на пытанні адносна выканання *права ЕС*

**10 траўня** — **Грузія** дасылае адказы на пытанні адносна выканання *права ЕС*

**12 траўня** — **Малдова** дасылае адказы на пытанні адносна выканання *права ЕС*

**17 чэрвеня** — Еўрапейская камісія прымае свае заключэнні па заяўках на сяброўства ў ЕС

**24 чэрвеня** — Еўрапейская рада прызнала для **Украіны**, **Малдовы** і **Грузіі** перспектыву сяброўства ў Еўрапейскім саюзе. Еўрапейская рада таксама надала статус краінаў-кандыдатаў **Украіне** і **Малдове**. **Грузія** атрымае статус кандыдата пасля таго, як будзе вырашаным шэраг прыярытэтных задачаў.



## Што далей?

Еўрапейская камісія будзе ацэньваць прагрэс, зроблены кожнай з трох краінаў, у сваім рэгулярным пакеце справаздачаў пра пашырэнне.

© Еўрапейскі Саюз, 2022
Паўторнае выкарыстанне гэтага дакумента дапускаецца пры ўмове пазначэння адпаведнай спасылкі і любых зменаў (Міжнародная ліцэнзія Creative Commons Attribution 4.0). Для выкарыстання або рэпрадукцыі элементаў, якія не належаць ЕС, можа спатрэбіцца дазвол непасрэдна адпаведных праваўладальнікаў. Усе выявы ©Еўрапейскі саюз, калі не пазначана іншае, Icons-© Flaticon.